Што я ведаю і ўмею

З.Я. Кузьміч

# Беларуская мова

## 2 клас

### Сшытак для замацавання ведаў

Экоперспектива

*Серыя «Што я ведаю і ўмею»*

**З.Я. Кузьміч**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 2 клас

## Сшытак для замацавання ведаў

*Дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з рускай мовай навучання*

Мінск
«Экоперспектива»
2020

УДК 811.161.3(075.2=161.1)
ББК 81.2Беи-922
К89

Серыя заснавана ў 2018 годзе

**Кузьміч, З.Я.**
К89 Беларуская мова : 2-гі кл. : сшытак для замацавання ведаў : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / З.Я. Кузьміч. — Мінск : Экоперспектива, 2020. — 72 с. — (Серыя «Што я ведаю і ўмею»).
ISBN 978-985-469-735-2.

Дапаможнік складзены ў адпаведнасці з падручнікам для 2-га класа агульнаадукацыйных устаноў з рускай мовай навучання (аўтар В.І. Свірыдзенка) і мае на мэце зрабіць больш паспяховым працэс засваення вучэбнага матэрыялу. Заданні прапануюцца розных узроўняў складанасці, маюць творчы характар, павышаюць пісьменнасць і паспяховасць вучняў. Падабраныя практыкаванні можна выконваць падчас вывучэння адпаведных тэм на ўроку або дома пры арганізацыі паўтарэння і замацавання ведаў.

Адрасуецца вучням 2-х класаў, педагогам I ступені агульнай сярэдняй адукацыі і бацькам.

**УДК 811.161.3(075.2=161.1)**
**ББК 81.2Беи-922**

**ISBN 978-985-469-735-2**

© Кузьміч З.Я., 2020
© Афармленне. УП «Экоперспектива», 2020

# Прадмова

Дадзены сшытак для замацавання ведаў змяшчае практычны матэрыял, які будзе спрыяць выпрацоўцы трывалых навыкаў граматнага пісьма, развіццю маўленчай дзейнасці, фарміраванню кампетэнтнасці вучняў, пашырэнню кругагляду, далучэнню праз мову да культурных традыцый беларускага народа.

Заданні падабраны ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы на аснове падручніка па беларускай мове для 2-га класа школ з рускай мовай навучання з мэтай дапоўніць і паглыбіць практычную частку падручніка, а таксама замацавання пройдзенага матэрыялу і сістэматызацыі ведаў вучняў.

На пачатку кожнай тэмы прапануецца перачытаць правілы, а потым практыкавацца ў іх прымяненні. Усе заданні выконваюцца непасрэдна ў сшытку, такім чынам павялічваецца час для прымянення атрыманых ведаў на практыцы. Усе практыкаванні ўзаемазвязаны і накіраваны на развіццё ўмення знаходзіць і тлумачыць арфаграмы, на пашырэнне слоўнікавага запасу вучняў.

Праца са сшыткам дапаможа вучням павысіць пісьменнасць і паспяховасць, дасягнуць поспеху ў працэсе вывучэння беларускай мовы.

Умоўныя абазначэнні

 — правяраю, што я ведаю

 — запісваю

 — разважаю

# Уступны моўны курс

## Гук [і], літары *І*, *і*

У беларускай мове ёсць некаторыя адрозненні ад рускай мовы. Напрыклад, гук **[і]** абазначаецца літарамі ***І***, ***і***.

**1.** Прачытай словы. Падкрэслі літару, якой няма ў рускай мове.

Кніга, Пінск, Мінск, мір, Аліна, сталіца, Ірына, Ігар, лімон, зіма.

**2.** Карыстаючыся малюнкамі, з літар складзі словы. Запішы. Падкрэслі літару ***і***.



ч, й, і, а, к, н



с, о, л, к, і



а, р, с, о, і, к

**3.** Замест кропак устаў у словы літару ***І, і***. Прачытай атрыманыя словы.

С_н_ца, п_сьмо, Л_за, м_шка, в_шня, _ван, раб_на, л_са, л_па, _ра.

**4.** Перакладзі словы на беларускую мову. Пры неабходнасці звяртайся да слоўніка. У беларускіх словах падкрэслі літару ***і***.

Учительница — ______________________

Утро — ______________________

Цветы — ______________________

Полотенце — ______________________

**5.** Запішы па-беларуску імёны хлопчыкаў і дзяўчынак з літарамі ***І, і***.

______________________

______________________

______________________

______________________

**6.** Знайдзі ў тэксце памылкі і выправі іх.

Наступіла восень. Нина і Марына идуць у школу. Дзяўчынки вучацца ў другім класе. Ніна і Марына — сяброўки.

# Апостраф (’)

Запомні! **Апостраф не з’яўляецца літарай.** Гэта **надрадковы знак.** Апостраф указвае на раздзельнае вымаўленне гукаў, што абазначаюцца літарамі, паміж якімі ён знаходзіцца. Пры чытанні слоў з апострафам заўсёды **вымаўляецца гук [й].**

**1.** Прачытай словы. Падкрэслі словы **з апострафам** і прачытай іх яшчэ раз, правільна вымаўляючы гукі, паміж якімі ён знаходзіцца.

| | | | |
|---|---|---|---|
| еў | п’е | верабей | сям’я |
| з’еў | п’юць | венраб’і | сямейка |
| пад’еў | вып’е | верабейка | сямейны |

**2.** Дапоўні сказы патрэбнымі словамі. Карыстайся словамі для даведкі.

Наша ______________ дружная.

Па дарожцы скачуць ______________.

Па даху ______________ дождж.

*Словы для даведкі:* б’е, вераб’і, сям’я.

**3.** З рассыпаных літар збяры і запішы словы, якія з’яўляюцца імёнамі. У кожнае з іх устаў апостраф, запомні напісанне.

Д, р, я, а ______________

М, я, а, р ______________

Д, з, м, я, н, я ______________

# Змест

**Прадмова** ................................. 3
**Уступны моўны курс** ................................. 5
Гук [і], літары *І*, *і* ................................. 5
Апостраф (’) ................................. 7
Гук [г], літары *Г*, *г* ................................. 8
Гук [ч], літары *Ч*, *ч*. Спалучэнне
гукаў [шч] ................................. 14
Гук [ў], яго абазначэнне на пісьме ................................. 11
Гук [ц’], літары *Ц*, *ц* ................................. 15
Гук [р], літары *Р*, *р* ................................. 17
Гук [дз’], яго абазначэнне на пісьме ................................. 20
Гук [дж], яго абазначэнне на пісьме ................................. 22
**Гукі і літары** ................................. 23
Гукі мовы. Абазначэнне гукаў на пісьме
літарамі ................................. 23
Беларускі алфавіт ................................. 25
Напісанне вялікай літары ў словах ................................. 26
Галосныя і зычныя гукі ................................. 29
Гукі [у], [ў]. Правапіс слоў з літарай *ў* ................................. 30
Склад. Падзел слоў на склады ................................. 33
Перанос слоў ................................. 35
Націск ................................. 37
Галосныя гукі [о], [э] — [а]. Правапіс слоў
з літарамі *о*, *э* — *а* ................................. 39
Правапіс слоў з літарамі *е*, *ё* — *я* ................................. 40
Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі.
Іх абазначэнне на пісьме ................................. 42

Зычныя гукі [д] — [дз] .......................... 44
Зычныя гукі [т] — [ц] .......................... 46
Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі .......................... 49
Звонкія і глухія зычныя. Іх абазначэнне на пісьме .......................... 51
Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме .......................... 54
Апостраф (’) і раздзяляльны мяккі знак (ь) .......................... 56
**Слова** .......................... 59
Значэнне слова. Знаёмства з перакладнымі слоўнікамі .......................... 59
Словы, якія называюць прадметы .......................... 61
Прыназоўнік. Правапіс прыназоўнікаў .......................... 64
Словы, якія называюць прыметы прадметаў .......................... 66
Словы, якія называюць дзеянні прадметаў .......................... 69
**Сказ** .......................... 72
Сказ. Афармленне сказа на пісьме. Вызначэнне сувязі слоў у сказе .......................... 72
**Тэкст** .......................... 76
Тэкст. Тэма і галоўная думка тэксту. Падзел тэксту на часткі .......................... 76

ISBN 978-985-469-735-2

ПО ВОПРОСАМ ПРИОБРЕТЕНИЯ
ОБРАЩАТЬСЯ ПО АДРЕСУ:
Издательское предприятие
**ЭКОПЕРСПЕКТИВА**
220033, г. Минск,
ул. Станиславского, 23, оф. 13
e-mail: ecoperspectiva@tut.by
тел./факс: (8017) 357-40-88
моб. тел.: (+37529) 621-91-71
*Приглашаем к сотрудничеству*
*распространителей учебной литературы*